ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.08.2025 № 140

Вучэбная праграма
па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» для V–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння зместу гэтага вучэбнага прадмета ў V–IX класах устаноў адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана:

для V класа на 70 гадзін (2 гадзіны на тыдзень), з іх 1 гадзіна рэзервовая;

для VI класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень), з іх 1 гадзіна рэзервовая;

для VII класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень), з іх 1 гадзіна рэзервовая;

для VIII класа на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень), з іх 1 гадзіна рэзервовая;

для IX класа на 52 гадзіны, з іх 2 гадзіны рэзервовыя.

Педагагічны работнік мае права з улікам асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі, вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і пазнавальных магчымасцей вучняў змяніць колькасць вучэбных гадзін і паслядоўнасць вывучэння матэрыялу ў межах вучэбнага часу, прызначанага для засваення зместу вучэбных тэм. Рэзервовы час дапушчальна выкарыстоўваць для правядзення кантролю ведаў і ўменняў вучняў.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя» – развіццё асобы вучня ў працэсе яго інтэграцыі ў сучаснае сацыякультурнае асяроддзе Беларусі пры засваенні асноў сістэматызаваных фактычных і тэарэтычных ведаў, авалоданні спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці з інфармацыяй пра найважнейшыя працэсы сусветнай гісторыі са старажытных часоў па першую чвэрць XXI ст., набыцці асабаснага жыццёвага вопыту, неабходнага для паспяховай сацыялізацыі асобы.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя»:

засваенне асноўных фактычных і тэарэтычных ведаў аб найважнейшых падзеях развіцця грамадства з інфармацыяй аб значных працэсах сусветнай гісторыі са старажытных часоў па першую чвэрць XXI ст.; авалоданне спецыяльнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры вывучэнні гісторыі (прадметныя кампетэнцыі);

фарміраванне вопыту пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці, развіццё ўменняў выкарыстоўваць засвоеныя веды, уменні, вопыт у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і жыццёвых сітуацыях (метапрадметныя кампетэнцыі);

фарміраванне асноў нацыянальнай, грамадзянскай, культурнай ідэнтычнасці асобы на аснове засваення сусветнай гісторыка-культурнай спадчыны і ўсведамлення месца Беларусі ў гэтай спадчыне; выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму (асобасныя кампетэнцыі).

5. У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца тлумачальна-ілюстрацыйныя, рэпрадуктыўныя, часткова-пошукавыя (эўрыстычныя), праблемнага выкладу, даследчыя (практычныя) метады. Сярод адпаведных ім форм навучання: гульнявая дзейнасць, удзел у распрацоўцы і рэалізацыі адукацыйных (даследчых) праектаў, арганізацыя вучэбнай дыскусіі, мадэляванне ўласных сацыяльных дзеянняў на прыкладзе паводзін чалавека ў гісторыі.

Рэкамендуемыя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці: каменціраванае (самастойнае) чытанне, складанне простага (разгорнутага) плана па змесце вучэбнага тэксту; характарыстыка гістарычных падзей (гістарычных асоб) па прапанаваным алгарытме; лакалізацыя гістарычных падзей у часе і прасторы з дапамогай карт (картасхем, атласаў) і складання храналагічных (сінхраністычных) табліц; падрыхтоўка паведамленняў (прэзентацый) аб гістарычных падзеях і асобах; складанне табліц (схем) з гістарычнай інфармацыяй (інфармацыйных, параўнальных) па прапанаваных крытэрыях; праектная дзейнасць.

6. Чаканыя вынікі засваення дадзенай вучэбнай праграмы:

6.1. асобасныя вынікі навучання арыентаваны на фарміраванне жыццёвага вопыту, светапогляду, асобаснай і грамадзянскай пазіцыі, каштоўнасных арыентацый асобы. Асобасныя вынікі засваення зместу дадзенай вучэбнай праграмы выяўляюцца ў тым, што вучань:

кіруецца традыцыйнымі каштоўнасцямі, агульнапрынятымі ў сучасным беларускім грамадстве (сям’я і таварыскія адносіны са сваякамі, сяброўства і ўзаемадапамога, верацярпімасць, здароўе і адукацыя);

ідэнтыфікуе сябе як жыхара Беларусі і грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

паважае нацыянальную і культурную спадчыну;

усведамляе значнасць сацыяльна адказных паводзін;

праяўляе поліэтнічную і полікультурную талерантнасць, павагу да чужога меркавання;

6.2. метапрадметныя вынікі навучання выяўляюцца ў тым, што вучань:

самастойна вызначае мэты свайго навучання, аналізуе і карэкціруе іх вынікі;

сістэматызуе і абагульняе змест вучэбнага матэрыялу і робіць на гэтай аснове аргументаваныя вывады;

аналізуе сучасную сацыяльную рэчаіснасць і прагназуе ўласную

жыццядзейнасць;

ажыццяўляе пошук, збор, апрацоўку розных крыніц інфармацыі, пераводзіць інфармацыю з візуальнага ў вербальны від і наадварот;

6.3. у адпаведнасці з прадметнымі вынікамі навучання вучням трэба засвоіць найважнейшыя факты, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця; найбольш істотныя прычынна-выніковыя сувязі; асноўныя гістарычныя паняцці. Прадметныя вынікі навучання прадстаўлены ў «Асноўных патрабаваннях да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

7. Змест навучання па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя» пабудаваны ў адпаведнасці з канцэнтрычным прынцыпам, што прадугледжвае засваенне зместу вучэбнага матэрыялу ў V–IX класах на падзейна-храналагічным узроўні.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў V КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(2 гадзіны на тыдзень, усяго 70 гадзін, у тым ліку 3 гадзіны – практычныя заняткі, 1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (2 гадзіны)

Свет старажытнай гісторыі. Паняцце «гісторыя Старажытнага свету». Гістарычныя крыніцы. Міфы.

Лічэнне гадоў у гісторыі. Узнікненне летазлічэння. Календары. Паняцці «да нашай эры», «наша эра», «стужка часу».

Урок-практыкум.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

значэнне паняццяў: гісторыя, «да нашай эры», «наша эра»;

храналагічныя межы гісторыі Старажытнага свету;

віды гістарычных крыніц;

умець:

суадносіць год гістарычнай падзеі са стагоддзем, тысячагоддзем, часам да нашай эры, нашай эры;

вызначаць месца гістарычнай падзеі на стужцы часу;

чытаць і запісваць стагоддзі рымскімі лічбамі;

рашаць задачы на лічэнне гадоў гісторыі.

## ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА.
## НА ШЛЯХУ ДА ЦЫВІЛІЗАЦЫІ (7 гадзін)

Найстаражытнейшыя людзі. Паходжанне чалавека. Першыя прылады працы і заняткі найстаражытнейшых людзей. Неандэртальцы. Выкарыстанне агню. Авалоданне маўленнем.

Першыя крокі чалавека сучаснага віду. З’яўленне «чалавека разумнага». Жыллё першабытных людзей. Родавая абшчына.

Узнікненне мастацтва і рэлігіі. Узнікненне мастацтва. Наскальны жывапіс. Скульптура. Рэлігійныя ўяўленні першабытных людзей.

З’яўленне земляробства і жывёлагадоўлі. Удасканаленне прылад працы і пераход да вытворчай гаспадаркі. Першыя земляробы і жывёлаводы. Узнікненне рамяства. Род і племя.

Пераход ад родавай абшчыны да суседскай. Пачатак выкарыстання металаў. Развіццё рамяства. Узнікненне абмену і гандлю. Суседская абшчына.

На шляху да цывілізацыі. Утварэнне саюзаў плямён. Асноўныя прыметы цывілізацыі. Узнікненне дзяржавы.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
## ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

азначэнні паняццяў: рэлігія, родавая абшчына, племя, дзяржава;

назвы перыядаў гісторыі першабытнага грамадства: каменны, бронзавы і жалезны вякі;

адметныя прыметы старажытных людзей: неандэрталец, краманьёнец («чалавек разумны»);

умець:

паказваць на гістарычнай карце месцы рассялення першабытных людзей;

тлумачыць паходжанне назваў перыядаў гісторыі першабытнага грамадства: каменны, бронзавы і жалезны вякі;

апісваць умовы жыцця старажытных людзей, іх занятак (паляванне, збіральніцтва, земляробства, жывёлагадоўля, рамяство) з апорай на вучэбны тэкст і ілюстрацыі;

тлумачыць значэнне пераходу ад прысвойваючай гаспадаркі да вытворчай;

складаць апавяданне пра рэлігійныя ўяўленні старажытных людзей, адкрыцці і вынаходкі першабытных людзей: агонь, прылады працы, рэлігія, мастацтва, выкарыстоўваючы вучэбны тэкст і ілюстрацыі.

## ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ І АМЕРЫКІ (24 гадзіны)

### Тэма 1. Старажытны Егіпет (6 гадзін)

Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта. Прыродныя ўмовы. Значэнне ракі Ніл у жыцці старажытных егіпцян. Найстаражытнейшыя земляробы ў даліне Ніла. Егіпцяне-рамеснікі.

Дзяржава фараонаў. Утварэнне адзінай дзяржавы ў даліне Ніла. Улада і становішча фараонаў. Лад старажытнаегіпецкай дзяржавы. Улада жрацоў.

Ператварэнне Старажытнага Егіпта ў магутную дзяржаву. Узмацненне старажытнаегіпецкай дзяржавы. Заваёўніцкія паходы Тутмаса III і Рамзеса II. Рэформы фараона Эхнатона. Заняпад улады і магутнасці фараонаў.

Быт і штодзённае жыццё старажытных егіпцян. Жыццё простых егіпцян. У доме знатнага егіпцяніна. Адзенне і знешняе аблічча старажытных егіпцян. Сям’я ў Старажытным Егіпце. Харчаванне старажытных егіпцян.

Рэлігія старажытных егіпцян. Вераванні старажытных егіпцян. Вера ў замагільнае жыццё. Абагаўленне жывёл і ракі Ніл.

Культура старажытных егіпцян. Мова і пісьменнасць. Школа. Мастацтва Старажытнага Егіпта. Навуковыя веды. Медыцына. Матэматыка.

### Тэма 2. Пярэдняя Азія ў старажытнасці (9 гадзін)

Старажытнае Міжрэчча. Прыродныя ўмовы Старажытнай Месапатаміі. Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі.

Станаўленне дзяржавы ў Месапатаміі. Рамёствы і гандаль. Узнікненне гарадоў-дзяржаў. Шумер і Акад.

Дзяржава Хамурапі. Уварванне качэўнікаў у Месапатамію. Заснаванне Вавілона. Стварэнне дзяржавы Хамурапі. Законы цара Хамурапі.

Асірыя і Вавілонія. Асірыйцы і іх дзяржава. Росквіт і гібель Асірыі. Дзяржава Навухаданосара.

Культура і рэлігія народаў Міжрэчча. Вынаходства пісьменства. Клінапіс. Веды жыхароў Старажытнага Міжрэчча. Месапатамскі каляндар. Рэлігія народаў Месапатаміі.

Хецкая дзяржава. Паходжанне хетаў. Утварэнне Хецкага царства ў Малой Азіі. Цар і царская ўлада. Заваёўніцкія паходы хетаў. Рэлігія хетаў.

Старажытны Іран. Прыродныя ўмовы і насельніцтва. Першыя дзяржавы. Узвышэнне Персідскай дзяржавы. Рэлігія Старажытнага Ірана.

Старажытная Фінікія. Прыродныя ўмовы і насельніцтва. Фінікійскія гарады-дзяржавы. Фінікійцы – гандляры і мараплаўцы. Фінікійскі алфавіт.

Старажытная Палесціна. Прыродныя ўмовы. Паходжанне яўрэяў. Царства Ізраіль. Распад Ізраільскага царства. Рэлігія яўрэяў.

Урок абагульнення.

### Тэма 3. Індыя і Кітай у старажытнасці (4 гадзіны)

Старажытная Індыя. Прыродныя ўмовы і насельніцтва. Узнікненне дзяржавы. Старажытныя арыі. Іх грамадства і гаспадарчае жыццё. Вялікая дзяржава цара Ашокі.

Культура Старажытнай Індыі. Мовы і пісьменнасць. Літаратура. Індыйскія Веды. Рэлігіі Старажытнай Індыі.

Узнікненне дзяржавы ў Кітаі. Краіна і насельніцтва. Заняткі старажытных кітайцаў. Стварэнне адзінай кітайскай дзяржавы. Імперыі Цынь і Хань.

Грамадства і культура Старажытнага Кітая. Грамадства Старажытнага Кітая. Канфуцый і яго вучэнне. Пісьменнасць. Навуковыя веды.

### Тэма 4. Старажытная Амерыка (2 гадзіны)

Найстаражытнейшае насельніцтва Амерыкі. З’яўленне чалавека ў Амерыцы. Найстаражытнейшае насельніцтва. Асноўныя заняткі людзей: паляванне і збіральніцтва. Пераход да земляробства.

Цывілізацыя альмекаў. Альмекі – стваральнікі найстаражытнейшай культуры на Амерыканскім кантыненце. Ла-Вента – горад альмекаў. Рэлігійныя ўяўленні і культура.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

азначэнні паняццяў: арашаемае земляробства, фараон, жрэц, іерогліф, клінапіс, горад-дзяржава, калонія;

асноўныя падзеі гісторыі цывілізацый Старажытнага Усходу, Амерыкі і іх даты: утварэнне дзяржавы ў Старажытным Егіпце; узнікненне

гарадоў-дзяржаў у Міжрэччы; праўленне Хамурапі; утварэнне дзяржавы ў старажытных яўрэяў, стварэнне адзінай кітайскай дзяржавы, утварэнне першых дзяржаў у Індыі;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры і вынікі іх дзейнасці: Эхнатон, Саргон Акадскі, Хамурапі, Навуходаносар, Дарый І, Цынь Шыхуандзі, Канфуцый;

культурныя дасягненні народаў Старажытнага Усходу і Амерыкі: піраміды, сфінкс, Вавілонская вежа, «Вісячыя сады» Семіраміды, фінікійскі алфавіт, Біблія, Веды, Вялікая кітайская сцяна, грабніца Цынь Шыхуандзі, свяцілішча ў Ла-Венце;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: цывілізацыі і дзяржавы Старажытнага Усходу і Амерыкі: Старажытны Егіпет, Міжрэчча (Месапатамія), Асірыя, Вавілон, Хецкая дзяржава, Персідская дзяржава, Фінікія, Палесціна, Старажытная Індыя, Старажытны Кітай, альмекі; характарызаваць іх геаграфічнае месцазнаходжанне з выкарыстаннем назваў кантынентаў, бакоў свету і назваў рэк: Ніл, Тыгр і Еўфрат, Інд, Хуанхэ, Янцзы, у даліне якіх яны былі размешчаны; месцы вывучаных гістарычных падзей;

чытаць фрагменты гістарычных дакументаў (Законы Хамурапі), адказваць на пытанні да іх;

складаць апавяданне пра прыродныя ўмовы, жыццё і заняткі, рэлігійныя ўяўленні насельніцтва, дасягненні цывілізацый Старажытнага Усходу і Амерыкі з апорай на вучэбны тэкст і ілюстрацыі.

## СТАРАЖЫТНАЯ ГРЭЦЫЯ (17 гадзін)

Прырода і насельніцтва Старажытнай Грэцыі. Прыродныя ўмовы. Грэцыя мацерыковая і астраўная. Паходжанне старажытных грэкаў. Заняткі старажытных грэкаў.

Мінойскі Крыт і яго культура. Фарміраванне Крыцкай цывілізацыі. Легендарны цар Мінас. Росквіт і гібель Крыцкай цывілізацыі. Культура і рэлігія Старажытнага Крыта. Кноскі палац.

Ахейская Грэцыя. Ахейская заваяванне Грэцыі. «Золатабагатыя Мікены». Траянская вайна. Культура ахейскай Грэцыі. Дарыйская заваяванне.

Рэлігія старажытных грэкаў. Вера ў існаванне звышнатуральных сіл. Багі-алімпійцы. Культ, ці шанаванне багоў. Ахвярапрынашэнні.

Узнікненне грэчаскага поліса. Пачатак эпохі жалеза ў Старажытнай Грэцыі. Развіццё рамяства і гандлю. Поліс – горад-дзяржава. Грамадзяне поліса. Арыстакраты і дэмас.

Вялікая грэчаская каланізацыя. Прычыны каланізацыі. Заснаванне калоній у Міжземнамор'і і Прычарнамор'і. Грэкі і варвары. Вынікі і гістарычнае значэнне грэчаскай каланізацыі.

Старажытная Спарта. Узнікненне Спартанскай дзяржавы. Органы ўлады. Спартыяты і ілоты. Спартанскі лад жыцця.

Узнікненне і развіццё Афінскай дзяржавы. Старажытныя Афіны. Законы Салона.

Грэка-персідскія войны і росквіт Афін. Паходы персаў супраць Грэцыі. Марафонская бітва. Перамога грэкаў над персамі. Улада дэмаса ў Афінах. Асноўныя рысы афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі.

Пелапанэская вайна і заняпад Афін. Рост варожасці паміж Афінамі і Спартай. Ваенныя дзеянні паміж дзвюма дзяржавамі. Збядненне грамадзян. Наступствы Пелапанэскай вайны.

Дзяржава Аляксандра Македонскага. Барацьба грэчаскіх полісаў з Македоніяй. Заваяванне Грэцыі Македоніяй. Заваяванні Аляксандра Македонскага. Разгром Персідскай дзяржавы. Дзяржава Аляксандра і яе распад.

Старажытнагрэчаская школа, навуковыя веды і рэлігія. Пісьменнасць і школа. Навуковыя веды. Грэчаскія філосафы. Рэлігійныя святы.

Старажытнагрэчаскае мастацтва. Архітэктура. Знакамітыя збудаванні Афін. Скульптура і кераміка. Праслаўленыя скульптары – Фідзій, Міран, Паліклет, Праксіцель. Жывапіс.

Старажытнагрэчаскі тэатр і святы. Тэатр як самае папулярнае відовішча. Трагедыі і камедыі. Знакамітыя старажытнагрэчаскія драматургі – Эсхіл, Сафокл і Эўрыпід. Алімпійскія гульні.

Паўсядзённае жыццё старажытных грэкаў. Жыццё ў горадзе-полісе. Жыллё і быт. Харчаванне і адзенне.

Эліністычная культура. Узнікненне эліністычнай культуры. Александрыя Егіпецкая. Эліністычная навука. Выдатны вучоны Архімед. «Цуды» Старажытнага свету.

Урок абагульнення

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Старажытнай Грэцыі і іх даты: Траянская вайна, Вялікая грэчаская каланізацыя, грэка-персідскія войны, Марафонская бітва, Пелапанэская вайна, заваёўніцкія паходы Аляксандра Македонскага, першыя Алімпійскія гульні;

азначэнні паняццяў: дэмас, дэмакратыя, арыстакратыя, грамадзянін, поліс, каланізацыя;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Старажытнай Грэцыі і вынікі іх дзейнасці: Перыкл, Аляксандр Македонскі, Гамер, Сакрат, Фідзій, Паліклет, Мірон, Архімед;

культурныя дасягненні Старажытнай Грэцыі: паэмы «Іліяда» і «Адысея», тэатр, Алімпійскія гульні, Парфенон, статуі Афіны і Зеўса, Афінскі акропаль, помнікі, якія адносяць да «цудаў свету»;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыі старажытнагрэчаскіх дзяржаў, характарызаваць іх геаграфічнае месцазнаходжанне з выкарыстаннем назваў бакоў свету, назваў геаграфічных аб’ектаў: Балканскі паўвостраў, востраў Крыт, Міжземнае, Іанічнае, Эгейскае моры; месцы вывучаных гістарычных падзей;

складаць апавяданне аб прыродных умовах жыцця, занятках, рэлігійных вераваннях старажытных грэкаў, культурных дасягненнях старажытнагрэчаскай цывілізацыі, гістарычных падзеях, гістарычных дзеячах і дзеячах культуры Старажытнай Грэцыі на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацый і схем;

перадаваць змест вядомых старажытнагрэчаскіх міфаў і легенд; тлумачыць сэнс крылатых выразаў, якія ўзніклі ў Старажытнай Грэцыі;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: сістэмы кіравання Афінамі і Спартай;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычыны і наступствы гістарычных падзей: Вялікая грэчаская каланізацыя, грэка-персідскія войны, Пелапанэская вайна, паходы Аляксандра Македонскага.

## СТАРАЖЫТНЫ РЫМ (14 гадзін)

Легендарны пачатак Рыма. Прырода і насельніцтва Італіі. Ромул – заснавальнік Рыма. Рымскія цары. Патрыцыі і плебеі. Звяржэнне царскай улады.

Ранняя Рымская рэспубліка. Устанаўленне Рэспублікі і органы кіравання. Барацьба плебеяў з патрыцыямі. Законы XII табліц. Правы і абавязкі рымскіх грамадзян.

Заваяванне Рымам Італіі. Войны Рыма з суседнімі плямёнамі. Нашэсце галаў на Рым. Вайна з царом Пірам. Устанаўленне кантролю над Італіяй.

Заваяванне Рымам Міжземнамор’я. Войны Рыма з Карфагенам (Пунічныя войны). Паход Ганібала на Рым. Вынікі Пунічных войнаў.

Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме. Уплыў заваёўніцкіх войнаў на рымскае грамадства. Збядненне земляробаў. Зямельныя рэформы братоў Гракхаў. Ваенная рэформа Гая Марыя.

Рабаўладанне ў Рыме. Крыніцы рабства ў Старажытным Рыме. Становішча рабоў. Паўстанне Спартака: прычыны, ход і гістарычнае значэнне.

Падзенне Рымскай рэспублікі і стварэнне імперыі. Грамадзянскія войны. Праўленне Цэзара. Прыход да ўлады Актавіяна Аўгуста і станаўленне імперыі.

Улада рымскіх імператараў. Паўнамоцтвы рымскіх імператараў. Рымскія імператары: Тыберый, Нерон, Траян і Дыяклецiян.

Рым – сталіца імперыі. «Усе дарогі вядуць у Рым». Паўсядзённае жыццё простых грамадзян. Грамадскія лазні – тэрмы.

Культура Старажытнага Рыма. Рымляне – вучні грэкаў. Рымская літаратура і яе значэнне. Асноўныя помнікі архітэктуры і скульптуры.

Рэлігія старажытных рымлян. Багі ў прыватным жыцці рымлян. Багі Рымскай дзяржавы. Пантэон Рыма.

Хрысціянства ў Рымскай імперыі. Вучэнне Ісуса Хрыста і зараджэнне новай рэлігіі. Распаўсюджанне хрысціянства і прызнанне яго афіцыйнай рэлігіяй імперыі. Новы Запавет.

Падзенне Заходняй Рымскай імперыі. Крызіс гаспадаркі і кіравання ў Рымскай імперыі. Падзел Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю. Рым і варвары. Узяцце Рыма готамі і вандаламі. Гібель Заходняй Рымскай імперыі.

Урок-практыкум.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі Старажытнага Рыма і іх даты: заснаванне Рыма, Пунічныя войны, паўстанне Спартака, падзел Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю, падзенне Заходняй Рымскай імперыі;

азначэнні паняццяў: рэспубліка, патрыцыі, плебеі, сенат, вета, варвары, хрысціянства, царква;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Старажытнага Рыма і вынікі іх дзейнасці: Ромул, Ганібал, Тыберый і Гай Гракхі, Спартак, Юлій Цэзар, Актавіян Аўгуст, Вергілій, Гарацый;

найважнейшыя культурныя дасягненні Старажытнага Рыма;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыю Старажытнай Італіі; характарызаваць яе геаграфічнае месцазнаходжанне з выкарыстаннем назваў бакоў свету, назваў геаграфічных аб'ектаў: Апенінскі паўвостраў, Міжземнае мора, востраў Сіцылія; тэрыторыю Рымскай імперыі; межы Заходняй і Усходняй Рымскай імперыі; месцы вывучаных гістарычных падзей;

складаць апавяданне аб прыродных умовах, жыцці і занятках, рэлігійных вераваннях старажытных рымлян, культурных дасягненнях старажытнарымскай цывілізацыі, гістарычных падзеях, гістарычных дзеячах і дзеячах культуры Старажытнага Рыма на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацый і схем;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычыны і наступствы гістарычных падзей: Пунічныя войны, прыняцце хрысціянства, падзенне Заходняй Рымскай імперыі;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: сістэмы кіравання Старажытнарымскай дзяржавай у розныя перыяды яе гісторыі (царскі Рым, Рымская рэспубліка, Рымская імперыя), рэлігійныя вераванні старажытных рымлян і старажытных грэкаў.

## СТАРАЖЫТНЫЯ ГЕРМАНЦЫ І СЛАВЯНЕ (2 гадзіны)

Старажытныя германцы. Паходжанне і рассяленне германскіх плямёнаў. Грамадскі лад германцаў. Германцы і Рым.

Старажытныя славяне. Паходжанне і рассяленне старажытных славян. Грамадскія адносіны. Культура і рэлігійныя вераванні.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

назвы трох груп славянскіх плямёнаў;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыю рассялення германскіх і славянскіх плямёнаў; характарызаваць тэрыторыю іх рассялення з выкарыстаннем геаграфічных назваў: Еўропа, Скандынаўскі і Ютландскі паўвостравы, Балканскі паўвостраў, рэкі Рэйн і Одэр, Днепр, Вісла; месцы рассялення трох груп славян;

складаць апавяданне пра ўмовы жыцця, асноўныя заняткі, грамадскія адносіны, рэлігійныя вераванні старажытных германцаў і славян на аснове вучэбнага тэксту і ілюстрацый.

Выніковае абагульненне.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін, у тым ліку
1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Сярэднявечча ў гісторыі чалавецтва. Храналагічныя межы і перыядызацыя Сярэдніх вякоў. Асноўныя крыніцы па гісторыі Сярэднявечча.

### ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА І ВІЗАНТЫЯ (15 гадзін)

#### Тэма 1. Ранняе сярэднявечча (3 гадзіны)

Заходняя Еўропа ў V–IX стст. Заняпад Заходняй Еўропы. Змяненні ў грамадскім жыцці германцаў. Варварскія каралеўствы. Палітычная карта Еўропы ў Раннім сярэдневякоўі. Царква і распаўсюджванне хрысціянства.

Дзяржава франкаў. Хлодвіг – кароль франкаў. Адносіны ў грамадстве. Росквіт дзяржавы франкаў пры Карле Вялікім. Франкская імперыя. Царква ў дзяржаве франкаў. Распад Франкскай імперыі.

Візантыйская імперыя. Усходняя Рымская імперыя – Візантыя. Асаблівасці развіцця Візантыі. Дзяржаўны лад. Росквіт Візантыі пры праўленні Юстыніяна. Візантыя – цэнтр высокай культуры.

#### Тэма 2. Высокае сярэднявечча (8 гадзін)

Феадальны лад у Заходняй Еўропе X–XIII стст. Феадалы: сеньёры і васалы. Феадалы і сяляне. Натуральная гаспадарка. Феадальная раздробленасць.

Сярэдневяковы горад. Прычыны і шляхі ўзнікнення гарадоў. Горад і натуральная гаспадарка. Таварна-грашовая гаспадарка. Гарадское рамяство. Барацьба гараджан за самакіраванне.

Штодзённае жыццё чалавека. Быт сялян. Жыццё феадалаў. Быт гараджан.

Краіны Заходняй і Паўднёвай Еўропы. Францыя ў X–XIII стст. Германія і Італія ў Высокім сярэднявеччы. Стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі. Краіны Пірэнейскага паўвострава. Рэканкіста.

Англія і краіны Скандынавіі ў X–XIII стст. Паходы вікінгаў. Дзяржавы Скандынавіі. Нармандскае заваяванне Англіі. Каралеўская ўлада. Войны англійскіх каралёў. Узнікненне англійскага парламента.

Каталіцкая царква. Царкоўны раскол 1054 г. Каталіцкая і праваслаўная цэрквы. Папы рымскія – уладыкі Заходняй Еўропы ў XIII ст. Крыжовыя паходы.

Заходнееўрапейская культура Высокага Сярэднявечча. Прычыны ўздыму культуры ў Заходняй Еўропе. Адукацыя, універсітэты. Развіццё навуковых ведаў. Архітэктура. Літаратура.

Візантыя ў X–XIII стст. Асаблівасці развіцця Візантыі. Візантыйскія гарады і гандаль. Царква ў Візантыі. Чацвёрты крыжовы паход і Візантыя.

### Тэма 3. Позняе сярэднявечча (4 гадзіны)

Познефеадальнае грамадства ў Заходняй Еўропе. Развіццё сельскай гаспадаркі. Вызваленне сялян ад асабістай залежнасці. Мануфактурная вытворчасць. Цэнтралізаваная дзяржава. Саслоўна-прадстаўнічая манархія. Дзяржавы Заходняй Еўропы і каталіцкая царква.

Стагадовая вайна. Прычыны Стагадовай вайны. Асноўныя ваенныя дзеянні. Жанна д’Арк. Вынікі Стагадовай вайны.

Краіны Заходняй Еўропы і Візантыя ў XIV–XV стст. Цэнтралізаваныя дзяржавы. Францыя і Англія. Свяшчэнная Рымская імперыя. Іспанія. Падзенне Візантыі.

Ранняе Адраджэнне. Узнікненне культуры Адраджэння. Яе характэрныя рысы. Дантэ, Петрарка. Мастацтва Ранняга Адраджэння. Кнігадрукаванне.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя перыяды гісторыі Сярэдніх вякоў: Ранняе сярэднявечча, Высокае сярэднявечча, Позняе сярэднявечча, іх храналагічныя межы;

асноўныя падзеі гісторыі Сярэдніх вякоў у Заходняй Еўропе і іх даты: Вялікае перасяленне народаў, утварэнне Франкскай імперыі і яе распад, утварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі, раскол хрысціянскай царквы, нармандскае заваяванне Англіі, крыжовыя паходы, Стагадовая вайна, пачатак кнігадрукавання ў Заходняй Еўропе;

азначэнні гістарычных паняццяў: Вялікае перасяленне народаў, феод, феадал, феадальная залежнасць, натуральная гаспадарка, таварна-грашовая гаспадарка, горад, цэх, мануфактура, паншчына, аброк, феадальная

раздробленасць, цэнтралізаваная дзяржава, Адраджэнне, саслоўна-прадстаўнічая манархія;

назвы саслоўна-прадстаўнічых органаў: парламент, Генеральныя штаты, іх асноўныя функцыі;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры ў сярэдневяковай Заходняй Еўропе і вынікі іх дзейнасці: Карл Вялікі, Юстыніян, Жана д’Арк, Роджэр Бэкан, Марка Пола, Дантэ Аліг’еры, Франчэска Петрарка, Сандра Батычэлі, Іаган Гутэнберг;

асноўныя дасягненні культуры Заходняй Еўропы ў перыяд Сярэднявечча;

умець:

паказваць на гістарычнай карце тэрыторыі еўрапейскіх дзяржаў у розныя перыяды Сярэднявечча: Візантыйская імперыя, Франкская дзяржава, Францыя, Англія, Іспанія і Партугалія, Свяшчэнная Рымская імперыя; месцы вывучаных гістарычных падзей;

суадносіць дату гістарычнай падзеі са стагоддзем, перыядам Сярэднявечча;

складаць апавяданне на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацый, гістарычнай карты пра найважнейшыя гістарычныя падзеі; гаспадарчыя заняткі сярэдневяковых еўрапейцаў; сярэдневяковы горад; паўсядзённае жыцці сярэдневяковых еўрапейцаў; гістарычных дзеячаў і дзеячаў культуры сярэдневяковай Заходняй Еўропы; дасягненні культуры ў сярэдневяковай Заходняй Еўропе;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі з’явамі: развіццё феадальных адносін – змяненне ў грамадскіх адносінах, поспехі ў сельскай гаспадарцы – рост гарадоў – развіццё таварна-грашовай гаспадаркі;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: рамесную майстэрню і мануфактуру, раздробленую і цэнтралізаваную дзяржаву, асаблівасці развіцця сярэдневяковых дзяржаў.

## СЛАВЯНЕ Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ (8 гадзін)

Славяне ў Раннім сярэднявеччы. Рассяленне славян. Грамадскі лад і заняткі славян. Вераванні славян. Утварэнне першых дзяржаў. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія.

Чэхія і Польшча ў X–XV стст. Чэхія ў Сярэднявеччы. Рух гусітаў. Польшча ў Сярэднявеччы. Грамадства і гаспадарка заходніх славян.

Лёсы славян Балканскага паўвострава. Балгарскія царствы. Сербскія дзяржавы. Харватыя. Асманскія заваяванні. Балканы пад уладай Асманскай дзяржавы.

Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы і яе першыя правіцелі. Усходнія славяне і іх суседзі. Ля вытокаў дзяржавы. Першыя кіеўскія князі. Прыняцце хрысціянства. Росквіт Кіеўскай Русі.

Раздробленасць Старажытнай Русі. Прычыны раздробленасці. Найбуйнейшыя дзяржавы-княствы. Наўгародская баярская рэспубліка. Барацьба з качэўнікамі. Мангольскае нашэсце на Русь. Націск крыжаносцаў.

Узмацненне Маскоўскага княства. Узвышэнне Масквы. Першыя маскоўскія князі. Дзмітрый Данскі і Кулікоўская бітва. Сельская гаспадарка, рамяство і гандаль.

Утварэнне адзінай Расійскай дзяржавы. Іван III – «гасудар усяе Русі». Стаянне на рацэ Угры. Дзяржаўны лад. Феадальнае грамадства. Судзебнік Івана III.

Праваслаўная царква і культура ўсходніх славян. Роля царквы ва ўсходнеславянскім грамадстве. Мітрапаліт Алексій і Сергій Раданежскі. Пісьменнасць і літаратура Старажытнай Русі. Архітэктура ўсходніх славян. Маскоўскі Крэмль. Рускі іканапіс.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі славянскіх народаў у Сярэднявеччы і іх даты: стварэнне першых славянскіх дзяржаў, гусіцкія войны, бітва на Косавым полі, прыняцце хрысціянства ва ўсходніх славян, Кулікоўская бітва, «стаянне» на рацэ Угры;

азначэнні гістарычных паняццяў: веча, князь, дружына, дзяржавы-княствы, Залатая Арда, Судзебнік;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры славянскіх народаў у Сярэднявеччы, вынікі іх дзейнасці: Кірыла і Мяфодзій, Ян Гус, Сімяон Вялікі, Стэфан Душан, Уладзімір Святаславіч, Яраслаў Мудры, Аляксандр Неўскі, Дзмітрый Данскі, Іван III, мітрапаліт Алексій, Сергій Раданежскі, Феафан Грэк, Андрэй Рублёў;

дасягненні культуры славянскіх народаў у перыяд Сярэднявечча: «Аповесць мінулых гадоў», «Слова аб палку Ігаравым», Руская Праўда, быліны, берасцяныя граматы, Сафійскія саборы ў Ноўгарадзе, Кіеве і Полацку, Маскоўскі крэмль, іканапіс;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыі рассялення славян; славянскія дзяржавы ў розныя перыяды Сярэднявечча: Польшча, Чэхія,

Балгарскія царствы, Сербскія дзяржавы, Старажытнаруская дзяржава, Наўгародская рэспубліка, Маскоўскае княства; месцы вывучаных гістарычных падзей;

складаць апавяданне на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацый, гістарычнай карты аб прыродных умовах і гаспадарчым жыцці славян у Сярэднявеччы; гістарычных дзеячах і дзеячах культуры славянскіх народаў; дасягненнях культуры славянскіх народаў у Сярэднявеччы;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: прыняцце хрысціянства ў Кіеўскай Русі і ў Франкскай дзяржаве, віды зямельнай уласнасці ў Кіеўскай Русі і краінах Заходняй Еўропы;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: прыняцце хрысціянства ва ўсходніх славян – развіццё культуры, мангольскае нашэсце – запаволенне развіцця рускіх зямель.

## ЦЫВІЛІЗАЦЫІ АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ (8 гадзін)

Узнікненне ісламу і Арабскі халіфат. Прыродныя ўмовы і насельніцтва Аравійскага паўвострава. Арабы напярэдадні аб’яднання ў адзіную дзяржаву. Мухамед і ўзнікненне ісламу. Стварэнне адзінай дзяржавы арабаў. Заваяванні арабаў. Росквіт і распад халіфата.

Араба-ісламская культура. Каран – святая кніга мусульман. Іслам у жыцці сярэдневяковых мусульман. Росквіт культуры халіфата. Навука, літаратура і мастацтва.

Іран і Сярэдняя Азія. Іран і Сярэдняя Азія пасля распаду Арабскага халіфата. Мангольскае нашэсце. Дзяржава Цімура. Культура Ірана і Сярэдняй Азіі.

Кітайская цывілізацыя. Насельніцтва сярэдневяковага Кітая і яго асноўныя заняткі. Дзяржава ў Кітаі. Кітай і качэўнікі. Рэлігіі сярэдневяковага Кітая. Культура Кітая.

Японская цывілізацыя. Утварэнне Японскай дзяржавы. Самураі. Барацьба з мангольскім нашэсцем. Рэлігіі і культура Японіі.

Індыйская цывілізацыя. Гаспадарчае жыццё Індыі. Каставы лад і рэлігіі. Дэлійскі султанат. Навука і культура.

Цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і Амерыкі. Асноўныя цывілізацыі Трапічнай Афрыкі. Амерыканскія цывілізацыі.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі сярэдневяковых цывілізацый Азіі, Афрыкі, Амерыкі і іх даты: прыняцце арабамі ісламу, стварэнне Арабскага халіфата, стварэнне Дэлійскага султанату, заваяванне Кітая манголамі і выгнанне захопнікаў з краіны;

азначэнні гістарычных паняццяў: іслам, халіфат, Каран, мячэць, самураі, касты;

імёны гістарычных дзеячаў і дзеячаў культуры сярэдневяковых цывілізацый Азіі, Афрыкі, Амерыкі і вынікі іх дзейнасці: Мухамед, Цімур, Біруні, Ібн Сіна, Фірдаўсі, Амар Хаям, Лі Бо, Ду Фу, Ван Вэй;

асноўныя рэлігіі Азіі, Афрыкі і Амерыкі: іслам, даасізм, канфуцыянства, будызм, індуізм, сінтаізм;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: найбуйнейшыя дзяржавы перыяду Сярэднявечча ў Азіі і Афрыцы: Арабскі халіфат, Дэлійскі султанат, Кітай, Японія, дзяржава Цімура, Гана, Малі, Эфіопія; амерыканскія цывілізацыі: майя, ацтэкі, інкі; месцы вывучаных гістарычных падзей;

складаць апавяданне на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацый, гістарычнай карты аб прыродных умовах і гаспадарчым жыцці цывілізацый Азіі, Афрыкі і Амерыкі; гістарычных дзеячах і дзеячах культуры ўсходніх цывілізацый; дасягненнях культуры ўсходніх цывілізацый; рэлігійных вераваннях народаў Азіі, Афрыкі, Амерыкі ў Сярэднявеччы;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: хрысціянства і іслам, сярэдневяковыя індыйскае і еўрапейскае грамадства, феадальныя адносіны ў Еўропе і Японіі;

знаходзіць у вучэбным тэксце і ўзнаўляць меркаванні, якія тлумачаць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: узнікненне ісламу – аб’яднанне арабаў – стварэнне Арабскага халіфата.

Выніковае абагульненне.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін, у тым ліку
1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Асноўны змест і перыядызацыя гісторыі Новага часу. Характэрныя рысы заходнееўрапейскай цывілізацыі. Асаблівасці развіцця ўсходніх

цывілізацый у Новы час.

## ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА (16 гадзін)

### Тэма 1. Ад Сярэднявечча да Новага часу (7 гадзін)

Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Пачатак Вялікіх геаграфічных адкрыццяў у канцы XV ст. Х. Калумб і адкрыццё Амерыкі. Першае кругасветнае падарожжа Ф. Магелана. Наступствы і значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Сцвярджэнне новых ідэй у эпоху Адраджэння. Гуманістычныя каштоўнасці эпохі Адраджэння. Мары гуманістаў пра ўсеагульнае шчасце і першыя ўтопіі (Э. Ратэрдамскі, Т. Мор, Т. Кампанела). Гуманізм твораў М. дэ Сервантэса і У. Шэкспіра.

Мастацтва эпохі Адраджэння. Прадстаўнікі італьянскага Адраджэння. Мастакі Паўночнага Рэнесансу.

Фарміраванне навуковай карціны свету. Вялікія адкрыцці М. Каперніка, Дж. Бруна, Г. Галілея. Ф. Бэкан. Уклад І. Ньютана ў стварэнне новай карціны свету. Развіццё медыцынскіх ведаў. У. Гарвей.

Рэфармацыя ў Германіі. Прычыны Рэфармацыі. Вучэнне М. Лютэра. Сялянская вайна ў Германіі. Утварэнне лютэранскай царквы.

Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе. Рэфармацыя ў Швейцарыі. Англіканская царква. Контррэфармацыя. Рэлігійныя войны ў Францыі.

Рэвалюцыя ў Нідэрландах. Прычыны рэвалюцыі. Іканаборскае паўстанне. Вызваленчая вайна супраць іспанскага панавання. Утрэхцкая унія. Нараджэнне незалежнай рэспублікі.

### Тэма 2. Заходняя Еўропа ў XVII–XVIII стст. (9 гадзін)

Асноўныя рысы эканамічнага развіцця. Змяненні ў сельскай гаспадарцы. Рост гарадоў і гандлю. Развіццё мануфактур. Пачатак прамысловага перавароту ў Англіі.

Штодзённае жыццё еўрапейцаў. Насельніцтва Еўропы. Жыццё ў еўрапейскім горадзе і вёсцы. Адзенне. Харчаванне. Гігіена.

Дзяржава ў XVII–XVIII стст. Формы дзяржаўнага праўлення. Абсалютызм. Сцвярджэнне і росквіт абсалютызму ў Францыі.

Еўрапейскія канфлікты і войны. Палітычная карта Еўропы і суперніцтва еўрапейскіх дзяржаў. Трыццацігадовая вайна і Вестфальскі мір. Вайна за іспанскую спадчыну. Сямігадовая вайна і яе наступствы.

Англійская буржуазная рэвалюцыя XVII ст. Прычыны і пачатак рэвалюцыі. Грамадзянскія войны. Рэспубліка і пратэктарат Кромвеля. Рэстаўрацыя Сцюартаў. «Слаўная рэвалюцыя». Гістарычнае значэнне англійскай буржуазнай рэвалюцыі.

Эпоха Асветніцтва. Ідэі Асветніцтва. Тэорыя натуральнага права і вучэнне аб грамадскай дагаворы. Вучэнне аб раздзяленні ўлад. Найбуйнейшыя прадстаўнікі Асветніцтва (Лок, Вальтэр, Мантэск'ё, Русо, Дзідро, Кант). Асветны абсалютызм.

Еўрапейская літаратура і мастацтва XVII–XVIII стст. Асноўныя напрамкі і стылі еўрапейскай культуры (барока і класіцызм). Архітэктура. Вялікія мастакі XVII ст. Ідэі Асвеніцтва ў літаратуры XVIII ст. Музычнае мастацтва.

Вялікая Французская рэвалюцыя XVIII ст. Прычыны і найважнейшыя падзеі рэвалюцыі: звяржэнне манархіі, устанаўленне рэспублікі, якабінская дыктатура. Устанаўленне ваеннай дыктатуры Напалеона Банапарта. Гістарычнае значэнне рэвалюцыі.

Заходнія і паўднёвыя славяне. Чэхія і Славакія. Росквіт і заняпад Польскай дзяржавы. Паўднёвыя славяне пад уладай Турцыі. Паўднёвыя славяне пад уладай Аўстрыі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя перыяды гісторыі Новага часу, іх храналагічныя межы;

асноўныя падзеі заходнееўрапейскай гісторыі ранняга Новага часу і іх даты: Вялікія геаграфічныя адкрыцці, Рэфармацыя, Нідэрландская буржуазная рэвалюцыя, Англійская буржуазная рэвалюцыя, Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя, утварэнне Рэчы Паспалітай і яе падзелы;

азначэнні гістарычных паняццяў: экспансія, калонія, метраполія, Адраджэнне (Рэнесанс), Рэфармацыя, Контррэфармацыя, буржуазная рэвалюцыя, мануфактура, прамысловая рэвалюцыя, абсалютызм, канстытуцыя, навуковая рэвалюцыя, грамадзянская вайна, канстытуцыйная манархія, Асветніцтва;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры ранняга Новага часу, вынікі іх дзейнасці: Хрыстафор Калумб, Фернан Магелан, Уільям Шэкспір, Мігель дэ Сервантэс, Леанарда да Вінчы, Рафаэль Санці, Мікеланджэла Буанароці, Мікалай Капернік, Джардана Бруна, Галілеа Галілей, Ісаак Ньютан, Марцін Лютэр, Жан Кальвін, Людовік XIV, Жан-Батыст Кальбер, Олівер Кромвель, Вальтэр, Жан Жак Русо, Дыега Веласкес, Рэмбрант, Рубенс, Іаган Себасцьян Бах, Вольфганг Амадэй Моцарт;

найважнейшыя дасягненні заходнееўрапейскай культуры, культуры паўднёвых і заходніх славян у перыяд ранняга Новага часу;

неабходныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: найбуйнейшыя еўрапейскія дзяржавы ранняга Новага часу: Англія, Францыя, Нідэрланды, Іспанія, Свяшчэнная Рымская імперыя, Рэч Паспалітая; маршруты падарожжаў падчас Вялікіх геаграфічных адкрыццяў; месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацый, урыўкаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі і з’явы: формы дзяржаўнага ладу ў Заходняй Еўропе, асноўныя прыметы развіцця капіталістычных падзей, прычыны, асноўныя падзеі і вынікі еўрапейскіх войнаў, прычыны, асноўныя падзеі і наступствы буржуазных рэвалюцый у Нідэрландах, Англіі і Францыі, гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: лютэранства, кальвінізм і англіканскую царкву; буржуазныя рэвалюцыі ў Нідэрландах, Англіі і Францыі, формы дзяржаўнага ладу, якія склаліся ў Заходняй Еўропе;

устанаўліваць і тлумачыць на аснове аналізу вучэбнага тэксту прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: памяншэнне значэння каталіцкай царквы – пачатак рэфармацыйнага руху, рост прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі – паляпшэнне ўмоў жыцця еўрапейцаў, развіццё капіталістычных адносін – буржуазныя рэвалюцыі.

## АМЕРЫКА (3 гадзіны)

Англійскія калоніі ў Паўночнай Амерыцы. Лёс індзейскага насельніцтва. Паўднёвыя і паўночныя калоніі. Развіццё культуры.

Вайна за незалежнасць і ўтварэнне Злучаных Штатаў Амерыкі (далей – ЗША). Рост супярэчнасцей паміж калоніямі і Англіяй. Пачатак вайны за незалежнасць. Ход ваенных дзеянняў. Дж. Вашынгтон. Дэкларацыя незалежнасці. Т. Джэферсан. Вынікі і значэнне вайны за незалежнасць. Канстытуцыя 1787 г.

Лацінская Амерыка. Каланіяльнае кіраванне. Эканамічнае жыццё еўрапейскіх калоній. Крэолы. Становішча карэннага насельніцтва. «Чорныя нявольнікі». Каталіцкая царква. Культура каланіяльнага перыяду.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі ранняга Новага часу ў Паўночнай і Лацінскай Амерыцы і іх даты: Вайна за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній, прыняцце Дэкларацыі незалежнасці, утварэнне ЗША, прыняцце Канстытуцыі ЗША;

азначэнні паняццяў: плантацыйная гаспадарка, фермерская гаспадарка, федэратыўная дзяржава, дыскрымінацыя;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Паўночнай і Лацінскай Амерыкі ў перыяд ранняга Новага часу і вынікі іх дзейнасці: Б. Франклін, Дж. Вашынгтон, Т. Джэферсан, Хуана Інэс дэ ла Крус;

найважнейшыя дасягненні культуры Паўночнай і Лацінскай Амерыкі ў перыяд ранняга Новага часу;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыі Паўночнай і Лацінскай Амерыкі; тэрыторыю ЗША, месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі: пачатак каланізацыі Паўночнай Амерыкі, прычыны, асноўныя падзеі і вынікі Вайны за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній; гістарычных асоб, помнікі культуры;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: плантацыйную і фермерскую гаспадарку;

устанаўліваць і тлумачыць на аснове аналізу тэксту прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: рост супярэчнасцей паміж паўночнаамерыканскімі калоніямі і Англіяй – вайна за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній – стварэнне ЗША.

## РАСІЯ (7 гадзін)

Расійская дзяржава ў XVI ст. Пачатак праўлення Івана IV. Выбраная Рада і яе рэформы. Ваенныя паходы Івана Грознага. Лівонская вайна. Апрычніна і яе наступствы.

Расія ў Смутны час. Праўленне Барыса Гадунова і пачатак Смуты. Грамадзянская вайна. Іншаземная інтэрвенцыя. Народнае апалчэнне пад кіраўніцтвам Кузьмы Мініна і Дзмітрыя Пажарскага.

Расія ў перыяд праўлення першых Раманавых. Узыходжанне дынастыі Раманавых. Пераадоленне наступстваў Смуты. Узмацненне прыгонніцтва. Паўстанне Сцяпана Разіна.

Расія ў эпоху Пятра Вялікага. Передумовы і пачатак пятроўскіх рэформ. Знешняя палітыка Пятра І. Паўночная вайна (1700–1721 гг.).

Ваенна-эканамічныя рэформы. Пераўтварэнне Расіі ў імперыю. Асоба Пятра I.

Унутраная і знешняя палітыка Расіі ў праўленне Кацярыны II. Палацавыя перавароты і прыход да ўлады Кацярыны II. Пашырэнне прывілеяў дваранства. Сялянская вайна 1773–1775 гг. Знешняя палітыка Кацярыны II.

Расійская культура ў XVI–XVIII стст. Развіццё кнігадрукавання, літаратуры. Адукацыя. Архітэктура. Тэатр. Выяўленчае мастацтва. Перамены ў побыце.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі славянскіх народаў і Расіі ў перыяд ранняга Новага часу і іх даты: праўленне Івана Грознага, пачатак праўлення Раманавых, праўленне Пятра I, Паўночная вайна, праўленне Кацярыны II, паўстанне пад кіраўніцтвам Емяльяна Пугачова, пачатак кнігадрукавання ў Расіі;

азначэнні паняццяў: Земскі сабор, Судзебнік, рэкрут;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Расіі ў перыяд ранняга Новага часу, вынікі іх дзейнасці: Іван Грозны, Барыс Гадуноў, Ілжэдзмітрый I, Міхаіл Раманаў, Пётр I, Кацярына II, Сцяпан Разін, Емяльян Пугачоў, Іван Фёдараў, Міхаіл Ламаносаў;

умець:

паказваць на гістарычнай карце: тэрыторыю Расіі ў розныя перыяды, месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя факты і падзеі: рэформы Івана Грознага, Пятра I, прычыны і вынікі Смутнага часу, Паўночнай вайны, сялянскіх паўстанняў, гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: мануфактурная вытворчасць у Расіі і Заходняй Еўропе, рэформы Івана Грознага і Пятра I, знешняя палітыка Пятра I і Кацярыны II;

устанаўліваць і тлумачыць на аснове аналізу тэксту прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: адставанне Расіі ад эканамічна развітых краін Еўропы – рэформы Пятра I, умацаванне дваранскага землеўладання – канчатковае запрыгоньванне сялян.

## УСХОДНІЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ (5 гадзін)

Асманская імперыя. «Залаты век» Асманскай імперыі. Іслам і стаўленне да еўрапейцаў. Заняпад Асманскай імперыі.

Японія. Аб’яднанне Японіі пад уладай Такугава. Саслоўі японскага грамадства. Адносіны з еўрапейцамі і палітыка самаізаляцыі. Культура.

Кітай. Заваяванне Кітая маньчжурамі. Грамадскі і дзяржаўны лад Цынскай імперыі. Абмежаванне кантактаў з еўрапейцамі. Развіццё культуры.

Індыя. Утварэнне імперыі Вялікіх Маголаў. Праўленне Акбара. Барацьба еўрапейскіх дзяржаў за панаванне ў Індыі. Культура Індыі магольскага перыяду.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі краін Азіі ў перыяд ранняга Новага часу і іх даты: разгром турэцкай арміі пад Венай, аб’яднанне Японіі пад уладай Такугава, заваяванне Кітая маньчжурамі, утварэнне імперыі Вялікіх Маголаў;

азначэнні паняццяў: сёгун, сіпаі, янычары;

імёны гістарычных і культурных дзеячаў Азіі і вынікі іх дзейнасці: Сулейман І Велічны, Такугава, Акбар;

найважнейшыя дасягненні культуры народаў Азіі ў ранні Новы час: ікебана, хайку, чайная цырымонія, маўзалей Тадж-Махал;

умець:

паказваць на гістарычнай карце дзяржавы Азіі: Асманская імперыя, Японія, Кітай, Індыя; месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі і з’явы: прычыны заняпаду Асманскай імперыі; аб’яднанне Японіі пад уладай Такугава, заваяванне Кітая маньчжурамі, барацьба еўрапейскіх дзяржаў за панаванне ў Індыі, гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

параўноўваць па прапанаваных крытэрыях гістарычныя факты: побыт еўрапейцаў і мусульман, уяўленні аб навакольным свеце еўрапейцаў і кітайцаў;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі на аснове аналізу тэксту: з'яўленне еўрапейцаў у Японіі і Кітаі – палітыка самаізаляцыі гэтых краін.

Выніковае абагульненне.

## ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў VIII КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень, усяго 35 гадзін, у тым ліку
1 гадзіна – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Агульная характарыстыка другога перыяду Новага часу. Рост насельніцтва. Стварэнне індустрыяльнай цывілізацыі. Каланіяльны падзел свету.

### ЗАХОДНЯЯ ЕЎРОПА (11 гадзін)

Заходняя Еўропа ў пачатку XIX ст. Устанаўленне дыктатуры Напалеона Банапарта і Першая імперыя ў Францыі. Напалеонаўскія войны. Краіны Еўропы ў час напалеонаўскіх войн. Венскі кангрэс. Стварэнне Свяшчэннага саюза.

Асноўныя рысы эканамічнага развіцця. Прамысловая рэвалюцыя і яе наступствы. Тэхнічны прагрэс у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Змяненні ў сацыяльнай структуры еўрапейскага грамадства. Пераход ад свабоднай канкурэнцыі да манаполіі.

Вялікабрытанія ў XIX – пачатку XX ст. Дзяржаўны лад. Эканамічнае развіццё. Унутраная палітыка: выбарчыя і сацыяльныя рэформы. Дзвюхпартыйная сістэма. Рабочы рух. Знешняя палітыка.

Францыя ў XIX – пачатку XX ст. Эканамічнае развіццё. Рэжым Рэстаўрацыі. Ліпеньская манархія. Другая імперыя. Трэцяя рэспубліка. Знешняя палітыка.

Еўрапейскія рэвалюцыі 1848–1849 гг. і іх вынікі. Прычыны, характар, рухаючыя сілы і асаблівасці рэвалюцый. Асноўныя падзеі рэвалюцый у Францыі, Германіі, Аўстрыйскай імперыі і Італіі. Вынікі рэвалюцый.

Германія ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Аб'яднанне Германіі і абвяшчэнне Германскай імперыі. Дзяржаўны лад. Эканамічнае развіццё. Унутраная і знешняя палітыка.

Міжнародны працоўны і сацыялістычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. Узнікненне марксізму. I і II Інтэрнацыяналы.

Адукацыя, навука і тэхніка. Развіццё адукацыі. Навука і фарміраванне новай карціны свету. Пераварот у тэхніцы і развіццё транспарту. Сувязь навукі з практыкай. Сродкі сувязі. Кінематограф.

Мастацкая літаратура. Рамантызм (В. Гюго, Дж. Г. Байран, П. Б. Шэлі, В. Скот, Э.-Т.-А. Гофман, Г. Гейне). Рэалізм (Стэндаль, А. дэ Бальзак, Ч. Дзікенс, Р. Кіплінг).

Выяўленчае мастацтва, архітэктура, музыка. Рамантызм і рэалізм у жывапісе (Ф. Гоя, Э. Дэлакруа, Дж. Канстэбл, Г. Курбэ і Ж. Міле). Імпрэсіянізм і постымпрэсіянізм (А. Рэнуар, К. Манэ, Э. Дэга, В. Ван Гог). Архітэктура. Музыка.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя перыяды гісторыі Новага часу, іх храналагічныя межы;

асноўныя падзеі гісторыі Заходняй Еўропы ў другі перыяд Новага часу і іх даты: устанаўленне дыктатуры Напалеона ў Францыі, Венскі кангрэс, стварэнне I і II Інтэрнацыяналаў;

азначэнні паняццяў: кантрыбуцыя, індустрыялізацыя, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, нацыя, марксізм;

імёны гістарычных, навуковых і культурных дзеячаў Заходняй Еўропы другога перыяду Новага часу, вынікі іх дзейнасці: Напалеон Банапарт, Джузэпэ Гарыбальдзі, Джузэпэ Мадзіні, Ота фон Бісмарк, Карл Маркс, Фрыдрых Энгельс, Чарлз Дарвін, Віктор Гюго, Стэндаль, Чарлз Дзікенс, Франсіска Гоя, Клод Манэ, Вінсент Ван Гог;

найважнейшыя дасягненні навукі і тэхнікі, культуры ў Заходняй Еўропе ў другі перыяд Новага часу: дасягненні ў медыцыне, фізіцы, біялогіі; паравы рухавік, рухавік унутранага згарання, электрычнасць, кінематограф, помнікі гісторыі, літаратуры і мастацтва XIX – пачатку XX ст.;

умець:

паказваць на гістарычнай карце межы дзяржаў Заходняй Еўропы XIX – пачатку XX ст., месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі і з’явы: напалеонаўскія войны, прамысловая рэвалюцыя, еўрапейскія рэвалюцыі 1848–1849 гг., аб’яднанне Германіі,

палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё заходнееўрапейскай цывілізацыі ў XIX ст. – 1918 г.; гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

вызначаць мастацкі стыль карцін, архітэктурных помнікаў па выяве.

## КРАІНЫ ПАЎНОЧНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ (4 гадзіны)

ЗША у першай палове XIX ст. Рост насельніцтва і пашырэнне тэрыторыі ЗША. Заваяванне Дзікага Захаду. Поўнач і Поўдзень – два шляхі развіцця. Рух за адмену рабства.

Грамадзянская вайна. ЗША ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. Грамадзянская вайна і яе вынікі. Эканамічнае і палітычнае развіццё ЗША пасля Грамадзянскай вайны. Знешняя палітыка ЗША.

Амерыканская літаратура і мастацтва. Амерыканскі рамантызм і яго асаблівасці (Г. Лангфела і Ф. Купер). Амерыканскі рэалізм (Г. Бічэр-Стоу, М. Твэн, Дж. Лондан і іншыя пісьменнікі). Жывапіс. Архітэктура.

Лацінская Амерыка. Вайна за незалежнасць іспанскіх калоній (1810–1826 гг.) і яе вынікі. Эканамічнае і палітычнае развіццё самастойных лацінаамерыканскіх дзяржаў. Рэвалюцыя ў Мексіцы (1910–1917 гг.). Развіццё лацінаамерыканскай культуры.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі краін Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі ў XIX – пачатку XX ст. і іх даты: грамадзянская вайна ў ЗША, вайна за незалежнасць іспанскіх калоній, рэвалюцыя ў Мексіцы;

азначэнні паняццяў: іміграцыя, канфедэрацыя, дыскрымінацыя;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, вынікі іх дзейнасці: Томас Джэферсан, Аўраам Лінкальн, Роберт Эдуард Лі, Марк Твэн, Джэк Лондан, Сімон Балівар;

умець:

паказваць на гістарычнай карце дзяржавы Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць гістарычныя падзеі і з’явы, гістарычных дзеячаў, помнікі культуры, палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі ў XIX – пачатку XX ст. на аснове вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў;

параўноўваць гістарычныя факты: сістэмы гаспадарання на Поўначы і Поўдні ЗША;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі і працэсамі: адрозненні ў эканамічным развіцці Поўначы і Поўдня ЗША – Грамадзянская вайна ў ЗША; палітыка Іспаніі і Партугаліі ў адносінах да сваіх калоній у Лацінскай Амерыцы – барацьба калоній за незалежнасць.

## РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ. СЛАВЯНСКІЯ КРАІНЫ (9 гадзін)

Расія ў першай палове XIX ст. Грамадскі і дзяржаўны лад. Айчынная вайна 1812 г. Унутраная і знешняя палітыка. Крымская вайна і яе вынікі.

Навука і культура Расіі ў першай палове XIX ст. Навука і адукацыя. Літаратура. Архітэктура і скульптура. Выяўленчае мастацтва. Тэатр і музыка.

Расія ў другой палове XIX ст. Адмена прыгоннага права. Рэформы 1860–1870-х гг. Палітыка Аляксандра III. Контррэформы. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі.

Рэвалюцыйны рух і палітыка царызму. Рэвалюцыйнае народніцтва. Забойства Аляксандра II. Зараджэнне рабочага руху. Распаўсюджанне марксізму і ўзнікненне расійскай сацыял-дэмакратыі.

Расія на мяжы XIX–XX стст. Эканамічнае развіццё. Змяненні ў сацыяльнай структуры грамадства. Знешняя палітыка Расіі. Руска-японская вайна і яе вынікі.

Расія ў пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і яе вынікі. Дзейнасць Дзяржаўнай думы. Рэформы П. А. Сталыпіна. Расія ў Першай сусветнай вайне. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. і яе вынікі.

Руская культура ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Развіццё навукі і асветы. Літаратура. Музыка. Жывапіс. Архітэктура.

Барацьба славянскіх народаў за нацыянальную незалежнасць у XIX – пачатку XX ст. Нацыянальна-вызваленчы рух паўднёвых славян. Нацыянальна-вызваленчы рух заходніх славян. Адраджэнне славянскіх нацыянальных культур.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі Расіі і славянскіх народаў у XIX – пачатку XX ст. і іх даты: Айчынная вайна 1812 г., Крымская вайна, буржуазныя рэформы XIX ст., руска-японская вайна 1904–1905 гг.,

рэвалюцыя 1905–1907 гг., рэформы Сталыпіна, Лютаўская буржуазная рэвалюцыя 1917 г.;

азначэнні паняццяў: самадзяржаўе, разначынцы, земствы, дзекабрысты, Дзяржаўная дума;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Расіі і славянскіх краін XIX – пачатку XX ст. і вынікі іх дзейнасці: М. І. Кутузаў, Аляксандр І, Мікалай І, А. С. Пушкін, М. Ю. Лермантаў, М. В. Гогаль, К. П. Брулоў, М. І. Глінка, Аляксандр ІІ, Аляксандр ІІІ, У. І. Ульянаў (Ленін), Мікалай ІІ, Д. І. Мендзялееў, А. С. Папоў, П. І. Чайкоўскі, Тарас Шаўчэнка;

умець:

паказваць на гістарычнай карце месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі: Айчынная вайна 1812 г., адмена прыгоннага права і іншыя буржуазныя рэформы, рэвалюцыя 1905–1907 гг., Лютаўская рэвалюцыя 1917 г., руска-японская вайна; гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі: эканамічнае адставанне Расіі ад заходнееўрапейскіх краін – пачатак буржуазных рэформ; эканамічны і палітычны крызіс у Расіі – буржуазна-дэмакратычныя рэвалюцыі; становішча заходніх і паўднёвых славян – рост нацыянальна-вызваленчага руху;

параўноўваць гістарычныя факты: эканамічнае развіццё Расіі ў першай палове XIX ст. і ў другой палове XIX – пачатку XX ст., рэформы 1861 г. і рэформы Сталыпіна, рэвалюцыя 1905–1907 гг. і Лютаўская буржуазная рэвалюцыя 1917 г.

## КРАІНЫ АЗІІ І АФРЫКІ (6 гадзін)

Японія. Японія напярэдадні рэвалюцыі 1868 г. Звяржэнне сёгуната Такугава. Рэформы і канстытуцыя. Перамены ў ладзе жыцця. Знешняя экспансія.

Кітай. Пранікненне еўрапейцаў у Кітай і «опіумныя» войны. Народныя паўстанні і рэформы. Сунь Ятсен. Рэвалюцыя 1911 г. і звяржэнне манархіі. Развіццё культуры.

Індыя. Індыя – англійская калонія. Антыкаланіяльнае паўстанне 1857–1859 гг. Індыйскі нацыянальны кангрэс. Культура.

Мусульманскі свет. Пранікненне еўрапейскіх дзяржаў у мусульманскія краіны. Нацыянальна-вызваленчыя рухі, рэформы і рэвалюцыі. Новае ў культуры і ладзе жыцця мусульманскіх краін.

Тэрытарыяльны падзел Афрыкі ў XIX ст. Пачатак захопу афрыканскіх зямель еўрапейскімі дзяржавамі. Берлінская канферэнцыя (1884–1885 гг.). «Вялікае афрыканскае паляванне». Барацьба Эфіопіі супраць еўрапейскай каланізацыі. Англа-бурская вайна.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі краін Азіі і Афрыкі ў XIX – пачатку XX ст., іх даты: рэвалюцыя 1868 г. у Японіі і рэформы 1868–1873 гг., паўстанне тайпінаў, паўстанне іхэтуаняў, рэвалюцыя 1911 г. у Кітаі, антыкаланіяльнае паўстанне ў Індыі 1857–1859 гг., англа-бурская вайна;

азначэнні паняццяў: каланіялізм, нацыяналізм;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Азіі і Афрыкі XIX – пачатку XX ст., вынікі іх дзейнасці: Сунь Ятсен, Рабіндранат Тагор, Селім III;

умець:

лакалізаваць на гістарычнай карце дзяржавы Азіі і Афрыкі, месцы вывучаных гістарычных падзей;

характарызаваць на аснове памяткі з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў гістарычныя падзеі і працэсы: палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Азіі і Афрыкі ў XIX – пачатку XX ст., паўстанні ў Індыі і Кітаі, рэвалюцыі ў Японіі і Кітаі, англа-бурская вайна, гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

параўноўваць гістарычныя факты: рэформы сярэдзіны XIX ст. у Японіі і Расіі, паўстанне тайпінаў і іхэтуаняў у Кітаі, эканамічнае і палітычнае развіццё Японіі і Кітая.

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА (2 гадзіны)

Пачатак Першай сусветнай вайны. Абвастрэнне міжнародных супярэчнасцей і наспяванне вайны ў Еўропе. Утварэнне Траістага саюза і Антанты і планы ваюючых бакоў. Ход ваенных дзеянняў у 1914–1916 гг.

Найважнейшыя палітычныя падзеі і ход ваенных дзеянняў у 1917–1918 гг. Наспяванне палітычнага крызісу ў ваюючых краінах. Уступленне ў вайну ЗША. Ход ваенных дзеянняў у 1917 г. Заключны перыяд вайны. Асноўныя вынікі Першай сусветнай вайны.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

храналагічныя межы Першай сусветнай вайны;

асноўныя краіны – удзельніцы вайны, ваенна-палітычныя блокі: Траісты саюз, Антанта;

асноўныя падзеі Першай сусветнай вайны і іх даты: бітва на Марне, «вердэнская мясарубка», Брусілаўскі прарыў, уступленне ў вайну ЗША, сепаратны мір Расіі з Германіяй у Брэст-Літоўску, Камп’енскае пераміp’е;

азначэнні паняццяў: маланкавая вайна, пазіцыйная вайна;

умець:

лакалізаваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі Першай сусветнай вайны, месцы найбуйнейшых бітваў; выкарыстоўваць гістарычную карту пры характарыстыцы ваенных дзеянняў;

характарызаваць з выкарыстаннем вучэбнага тэксту, ілюстрацыйнага матэрыялу і фрагментаў гістарычных дакументаў ваенныя і палітычныя падзеі Першай сусветнай вайны;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж ваеннымі падзеямі Першай сусветнай вайны і палітычнымі падзеямі ў Заходняй Еўропе і Расіі.

Выніковае абагульненне.

## ГЛАВА 6
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IX КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ
(усяго 52 гадзіны, у тым ліку 2 гадзіны – рэзервовы час)

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Мір пасля вайны. Паняцце «Навейшая гісторыя» і яе перыядызацыя. Краіны Захаду: асноўныя тэндэнцыі развіцця. Наступствы Першай сусветнай вайны. Сусветны эканамічны крызіс. Расія. За межамі еўрапейскага свету.

### КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1918–1939 гг. (8 гадзін)

Устанаўленне асноў пасляваеннага свету. Парыжская мірная канферэнцыя. Версальскі мірны дагавор. Стварэнне Лігі Нацый. Вашынгтонская канферэнцыя. Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін.

Заходняя Еўропа і ЗША ў 1918–1929 гг. Рэвалюцыя ў Германіі. Рэвалюцыйны ўздым у іншых краінах Еўропы. Узнікненне фашызму. Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ў перыяд адноснай стабілізацыі. Міжнародныя адносіны.

Сусветны эканамічны крызіс і краіны Захаду. Прычыны, асноўныя рысы і асаблівасці сусветнага эканамічнага крызісу. Шляхі выхаду з крызісу. «Новы курс» Ф. Рузвельта. Таталітарны варыянт выхаду з крызісу. Наступствы сусветнага эканамічнага крызісу. Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі.

Барацьба супраць фашызму ў еўрапейскіх краінах напярэдадні Другой сусветнай вайны. Усталяванне нацысцкага рэжыму ў Германіі. Народны фронт у Францыі. Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі. Антыфашысцкі рух.

Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг. Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Агрэсіўная палітыка фашысцкіх дзяржаў. Фарміраванне блока агрэсіўных дзяржаў. Мюнхенская канферэнцыя. Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Германа-савецкі дагавор аб ненападзенні.

Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Утварэнне незалежных дзяржаў. Устанаўленне аўтарытарных рэжымаў. Ліквідацыя Чэхаславацкай дзяржавы. Польшча ва ўмовах абвастрэння міжнароднага становішча ў 1930-х гг.

Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд. Прыродазнаўчыя навукі і навукова-тэхнічны прагрэс. Грамадскія навукі. Працяг традыцый рэалізму. Пошукі новых форм у мастацтве. Кіно. Архітэктура.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя перыяды гісторыі Навейшага часу і іх храналагічныя межы;

асноўныя падзеі гісторыі Заходняй Еўропы ў 1918–1939 гг. і іх даты: Парыжская мірная канферэнцыя, Версальскі дагавор, Вашынгтонская канферэнцыя, стварэнне Лігі Нацый, Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі, прыход да ўлады фашыстаў у Італіі, сусветны эканамічны крызіс, прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі, Грамадзянская вайна ў Іспаніі, Мюнхенская канферэнцыя, акупацыя Чэхаславакіі, падпісанне германа-савецкага дагавора аб ненападзенні;

азначэнні паняццяў: рэпарацыі, аншлюс, Ліга Нацый, «новы курс» Рузвельта, фашызм, нацызм, Народны фронт, палітыка «супакойвання» агрэсара;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры ў Заходняй Еўропе і ЗША ў 1918–1939 гг., вынікі іх дзейнасці: Дэвід Лойд Джордж, Жорж Клемансо, Франклін Дэлана Рузвельт, Альберт Эйнштэйн, Эрнэст Хемінгуэй, Эрых Марыя Рэмарк, Чарлз Чаплін;

умець:

паказваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі, якія адбываліся ў Заходняй Еўропе і ЗША ў міжваенны перыяд;

характарызаваць гістарычныя падзеі і працэсы, якія адбываліся ў Заходняй Еўропе і ЗША ў міжваенны час: Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, палітыка «супакойвання» агрэсара, сістэма калектыўнай бяспекі, таталітарны палітычны рэжым у Германіі, крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы; дзейнасць гістарычных асоб, палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, культурнае развіццё краін Заходняй Еўропы і ЗША ў 1918–1939 гг.;

параўноўваць гістарычныя факты: аўтарытарны і таталітарны рэжымы, шляхі выхаду з сусветнага эканамічнага крызісу.

## ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: 1917–1939 гг. (6 гадзін)

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі. Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе. Устанаўленне савецкай улады ў Расіі. Брэсцкі мір.

Грамадзянская вайна. Прычыны і этапы Грамадзянскай вайны ў Расіі. Асноўныя сілы і ўдзельнікі Грамадзянскай вайны. Ваенныя дзеянні на франтах Грамадзянскай вайны. Прычыны перамогі Чырвонай Арміі.

Курс на пабудову сацыялізму. Палітыка «ваеннага камунізму». Эканамічны і палітычны крызіс у краіне. Новая эканамічная палітыка. Індустрыялізацыя і калектывізацыя.

Палітычнае развіццё савецкай дзяржавы. Утварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР) і яго гістарычнае значэнне. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Знешняя палітыка СССР.

Культурныя пераўтварэнні ў СССР. Ліквідацыя масавай непісьменнасці і фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі. Навуковыя адкрыцці. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Савецкая дзяржава і царква.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі савецкага грамадства ў 1917–1939 гг. і іх даты: Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., Грамадзянская вайна ў Расіі, Брэсцкі мір, палітыка «ваеннага камунізму», новая эканамічная палітыка, утварэнне СССР, індустрыялізацыя, калектывізацыя, прыняцце канстытуцый у СССР;

азначэнні паняццяў: Грамадзянская вайна, ваенная інтэрвенцыя, харчразвёрстка, харчпадатак, індустрыялізацыя, калектывізацыя, культурная рэвалюцыя, культ асобы, аўтаномія, федэрацыя;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры ў СССР у 1917–1939 гг., вынікі іх дзейнасці: У. І. Ленін, А. В. Калчак, М. В. Фрунзе, А. Р. Стаханаў, І. В. Сталін, К. Э. Цыялкоўскі, У. І. Вярнадскі, І. В. Курчатаў, М. І. Вавілаў, М. Горкі, М. А. Шолахаў, С. С. Пракоф’еў, Д. Д. Шастаковіч, Л. П. Арлова;

умець:

лакалізаваць на гістарычнай карце падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Савецкай Расіі і СССР у міжваенны перыяд, найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры СССР;

характарызаваць гістарычныя падзеі і працэсы на тэрыторыі Савецкай Расіі і СССР у міжваенны перыяд: Кастрычніцкая рэвалюцыя, новая эканамічная палітыка, індустрыялізацыя, калектывізацыя; гістарычных дзеячаў, развіццё культуры;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з’явамі і працэсамі: Кастрычніцкая рэвалюцыя – Грамадзянская вайна, эканамічная разруха – новая эканамічная палітыка, індустрыялізацыя – калектывізацыя;

параўноўваць гістарычныя факты: палітыка «ваеннага камунізму» і новая эканамічная палітыка, план аўтанамізацыі і федэрацыі.

## КРАІНЫ УСХОДУ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ (1918–1945 гг.) (5 гадзін)

Кітай. Кітайская Рэспубліка пасля Першай сусветнай вайны. Нацыянальная рэвалюцыя 1925–1928 гг. Грамадзянская вайна 1928–1937 гг. Агрэсія Японіі ў Кітаі. Развіццё культуры.

Індыя. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху. Ідэалогія гандзізму. Саляны паход. Індыя ў гады Другой сусветнай вайны. Культура і лад жыцця індыйцаў.

Японія. Праблемы японскай эканомікі. Палітычнае развіццё. Прыход мілітарыстаў да ўлады. Знешняя палітыка. Японія ў гады Другой сусветнай вайны. Культура Японіі.

Мусульманскі свет. Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі 1918–1923 гг. Рэформы ў Іране. Дасягненне незалежнасці Афганістанам. Барацьба егіпецкага народа за незалежнасць. Культура і лад жыцця.

Лацінская Амерыка. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Палітыка ЗША ў адносінах да краін Лацінскай Амерыкі. Асаблівасці палітычнага развіцця: Аргенціна, Бразілія, Мексіка. Культура Лацінскай Амерыкі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918–1945 гг., іх даты: рух 4 мая, Нацыянальная рэвалюцыя ў Кітаі, абвяшчэнне Кітайскай Савецкай Рэспублікі, «саляны паход», Нацыянальная рэвалюцыя ў Турцыі, абвяшчэнне Турэцкай рэспублікі, вайна Японіі з Кітаем;

азначэнні паняццяў: гандызм, кемалізм, сат’яграха, ваенная дыктатура, шарыят;

імёны гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918–1945 гг., вынікі іх дзейнасці: Чан Кайшы, Маа Цзэдун, Махатма Гандзі, Рабіндранат Тагор, Мустафа Кемаль Атацюрк;

умець:

паказваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі, якія адбываліся ў краінах Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918–1939 гг.;

характарызаваць гістарычныя падзеі, з’явы і працэсы: гандзізм, мілітарысцкая ідэалогія ў Японіі, кемалізм, фундаменталізм і рэфармізм у ісламе; гістарычных дзеячаў, культурнае развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918–1945 гг.;

параўноўваць гістарычныя факты: асаблівасці нацыянальнага руху ў Кітаі і Індыі.

## ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА. ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (5 гадзін)

Пачатак Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Прычыны і характар Другой сусветнай вайны Захоп нацысцкай Германіяй краін Заходняй Еўропы. Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР і правал

стратэгіі «маланкавай вайны». Бітва за Маскву. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі.

Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Вырашальныя перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе. Ваенныя дзеянні армій ЗША і Англіі ў канцы 1942 – 1943 гг. Капітуляцыя Італіі. Вайна на Ціхім і Атлантычным акіянах. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

Барацьба з захопнікамі на акупаванай тэрыторыі. Нацысцкі «новы парадак». Рух Супраціўлення ў акупаваных краінах Еўропы. Барацьба савецкага народа ў тыле ворага.

Савецкі тыл падчас вайны. Перавод эканомікі на ваенны лад. Абаронная прамысловасць. Працоўны гераізм савецкага народа. Руская Праваслаўная Царква ў гады вайны. Штодзённае жыццё савецкіх людзей у тыле. Становішча ў блакадным Ленінградзе.

Заключны этап Другой сусветнай вайны. Пачатак вызвалення Чырвонай Арміяй еўрапейскіх краін. Адкрыццё другога фронту. Крымская канферэнцыя. Капітуляцыя Германіі. Патсдамская канферэнцыя. Паражэнне Японіі. Заснаванне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей – ААН). Цана і значэнне перамогі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

храналагічныя межы і перыядызацыю Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, найважнейшыя падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў і іх даты: «дзіўная вайна», бітва за Англію, бітва за Маскву, Сталінградская бітва, бітва на Курскай дузе, аперацыя «Баграціён», блакада Ленінграда, Тэгеранская, Крымская (Ялцінская), Патсдамская канферэнцыі, безагаворачная капітуляцыя Германіі, безагаворачная капітуляцыя Японіі, заснаванне ААН;

асноўных удзельнікаў супрацьпастаўленых блокаў у Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах;

азначэнні паняццяў: «дзіўная вайна», антыгітлераўская кааліцыя, ленд-ліз, карэнны пералом у вайне, «новы парадак», генацыд, Халакост, партызанскі рух, падпольная барацьба, рух Супраціўлення, другі фронт, эвакуацыя, безагаворачная капітуляцыя, ААН, Нюрнбергскі трыбунал;

імёны гістарычных дзеячаў, якія ўнеслі ўклад у разгром нацысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі: У. Чэрчыль, Г. К. Жукаў, А. М. Васілеўскі, К. К. Ракасоўскі, Б. Мантгомеры, Ш. дэ Голь, П. К. Панамарэнка, Г. Д. Эйзенхаўэр;

умець:

паказваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі пры характарыстыцы ваенных дзеянняў;

характарызаваць найважнейшыя ваенныя і палітычныя падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

параўноўваць гістарычныя факты: пачатковы перыяд Другой сусветнай вайны ў Еўропе і пачатак Вялікай Айчыннай вайны, Сталінградскую бітву і бітву пры Эль-Аламейне, рух Супраціўлення, партызанскі і падпольны рух на часова акупаванай тэрыторыі СССР, уклад СССР і саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў разгром ворага.

## КРАІНЫ ЕЎРОПЫ І ЗША Ў 1945 г. – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст. (8 гадзін)

Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны. «Халодная вайна». Разрадка міжнароднай напружанасці. Паварот ад разрадкі да канфрантацыі. Распад СССР і яго наступствы. Неакансерватыўная рэвалюцыя. Паглыбленне інтэграцыі і глабалізацыя.

ЗША. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1940-х – 1950-е гг. Макартызм. «Дзяржава дабрабыту». Рэформы 1960-х гг. Расавая праблема. Эканамічны крызіс 1970-х – пачатку 1980-х гг. Рэйганоміка. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя рэформы ў канцы 1990-х – першай чвэрці XXI ст. Знешняя палітыка.

Вялікабрытанія. Распад Брытанскай каланіяльнай імперыі. Унутраная і знешняя палітыка (1945–1964 гг.). Ірландская (Ольстэрская) праблема і шляхі яе вырашэння. Эканамічны крызіс 1970-х – пачатку 1980-х гг. Тэтчэрызм. Палітыка лейбарыстаў і кансерватараў у канцы XX – першай чвэрці XXI ст. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Вялікабрытанія і еўрапейская інтэграцыя.

Францыя. Рэжым Чацвёртай рэспублікі. Распад Французскай каланіяльнай імперыі. Пятая рэспубліка. Знешняя палітыка. Эканамічны ўздым у Францыі ў канцы 1950 – 1960-х гг. і крызіс 1970 -х гг. Спробы левага і неакансерватыўнага паваротаў у 1980-я гг. Палітычнае развіццё ў першай чвэрці XXI ст.

Германія. Утварэнне Федэратыўнай Рэспублікі Германія (далей – ФРГ) і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі (далей – ГДР). Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ФРГ. Будаўніцтва і крызіс сацыялізму ў ГДР. Аб’яднанне Германіі. ФРГ у канцы XX – першай чвэрці XXI ст.

Італія. Пасляваенныя дэмакратычныя пераўтварэнні. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1950–1970-х гг. Праблема Поўдня.

Унутрыпалітычны крызіс 1970–1980-х гг. Палітычныя перамены ў канцы XX – першай чвэрці XXI ст. Знешняя палітыка.

Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Пераўтварэнні першых пасляваенных гадоў. Поспехі і цяжкасці сацыялістычнага будаўніцтва. Нарастанне крызісу сацыялізму. «Аксамітныя рэвалюцыі» 1989–1991 гг. Распад Чэхаславакіі. Грамадзянская вайна ў Югаславіі. Інтэграцыя ў еўрапейскія структуры і Паўночнаатлантычны блок (далей – НАТА).

Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША. Развіццё навукі і адукацыі. Фарміраванне інфармацыйнага грамадства. Элітарная і масавая культура. Сацыяльныя матывы ў мастацтве. Архітэктура.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі Еўропы і ЗША ў пасляваенны перыяд, іх даты: утварэнне сусветнай сістэмы сацыялізму, «халодная вайна», Карыбскі крызіс, распад Брытанскай імперыі, распад Французскай імперыі, палітычны крызіс у Францыі (1968 г.), падзел Германіі, аб’яднанне Германіі, «будапешцкая восень», «пражская вясна», «аксамітныя рэвалюцыі», грамадзянская вайна ў Югаславіі, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, распад сацыялістычнага блока;

азначэнні паняццяў: «план Маршала», інтэграцыя, дэзынтэграцыя, разрадка міжнароднай напружанасці, «дактрына Трумэна», макартызм, НАТА, Арганізацыя Варшаўскага Дагавора, Савет эканамічнай узаемадапамогі, Еўрапейскі Саюз, інфармацыйнае грамадства;

імёны найважнейшых гістарычных дзеячаў, дзеячаў культуры Еўропы і ЗША пасляваеннага перыяду, вынікі іх дзейнасці: Марцін Лютэр Кінг, Маргарэт Тэтчэр, Шарль дэ Голь, Рональд Рэйган, Франсуа Мітэран, Конрад Адэнаўэр, Вілі Брант, Гельмут Коль, Федэрыка Феліні; Ле Карбюзье;

умець:

паказваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі, якія адбыліся ў Еўропе і ЗША ў 1945 г. – першай чвэрці XXI ст., тэрытарыяльныя змены пасля распаду сацыялістычнага блока; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з’явах і працэсах;

характарызаваць гістарычныя падзеі, з’явы і працэсы: «халодная вайна», Карыбскі крызіс, распад СССР і сацыялістычнага блока, палітыка неакансерватызму, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, постындустрыяльнае

(інфармацыйнае) грамадства; гістарычных дзеячаў, помнікі культуры краін Еўропы і ЗША у пасляваенны перыяд;

параўноўваць гістарычныя факты: палітыка лейбарыстаў у 1940–1950-я гг. і кансерватараў у 1960–1970-я гг. у Вялікабрытаніі, грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Заходняй Еўропы і краін сацыялістычнага блока.

## ГІСТОРЫЯ СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ
## (1945 г. – першая чвэрць XXI ст.) (7 гадзін)

СССР у 1945–1953 гг. Аднаўленне народнай гаспадаркі. Палітычнае развіццё краіны. Палітычныя рэпрэсіі. Знешняя палітыка.

СССР у 1953 г. – сярэдзіне 1960-х гг. СССР пасля смерці І. В. Сталіна. XX з’езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і яго рашэнні. Рэформы другой паловы 1950-х – першай паловы 1960-х гг. Знешняя палітыка.

СССР у сярэдзіне 1960-х – пачатку 1980-х гг. Эканамічная рэформа 1965 г. Эпоха «развітага сацыялізму». Грамадска-палітычнае жыццё. Праблемы знешняй палітыкі СССР.

Палітыка перабудовы і распад СССР. Крызіс 1980-х гг. Перабудова і крах палітыкі М. С. Гарбачова. Рэформа палітычнай сістэмы і яе наступствы. Жнівеньскі палітычны крызіс 1991 г. і распад СССР.

Расійская Федэрацыя. Расія на шляху да суверэнітэту. Радыкальная эканамічная рэформа. Кастрычніцкія падзеі 1993 г. і прыняцце Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Расіі ў 1994 – 1999 гг. Расія ў першай чвэрці XXI ст.

Навука і культура ў СССР і Расійскай Федэрацыі. Адукацыя і навука ў СССР. Мастацкая культура і літаратура. Духоўнае жыццё Расіі ў канцы XX – першай чвэрці XXI ст.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
## ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

найважнейшыя падзеі гісторыі савецкага грамадства і Расійскай Федэрацыі ў пасляваенны перыяд, іх даты: XX з’езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, пачатак асваення космасу, эканамічная рэформа 1965 г., вайна ў Афганістане, перабудова, распад СССР, утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (далей – СНД);

азначэнні паняццяў: валюнтарызм, рэабілітацыя, дэмакратызацыя, перабудова, галоснасць, СНД;

імёны найважнейшых палітычных дзеячаў СССР і Расійскай Федэрацыі ў пасляваенны перыяд, вынікі іх дзейнасці: М. С. Хрушчоў, Л. І. Брэжнеў, М. С. Гарбачоў, Б. М. Ельцын, У. У. Пуцін;

умець:

лакалізаваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі і працэсы 1945 г. – пачатку XXI ст., якія адбываліся на тэрыторыі СССР і СНД; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах і працэсах;

характарызаваць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы: распад СССР, асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Расійскай Федэрацыі, асноўныя напрамкі і вынікі расійска-беларускай інтэграцыі і інтэграцыі краін СНД; гістарычных дзеячаў, помнікі культуры;

параўноўваць гістарычныя факты: сталінскі палітычны рэжым і хрушчоўская «адліга», экстэнсіўны і інтэнсіўны шляхі развіцця эканомікі, грамадска-палітычны лад у СССР у сярэдзіне 1960-х – першай палове 1980- х гг. і ў гады перабудовы.

## КРАІНЫ АЗІІ, АФРЫКІ І ЛАЦІНСКАЙ АМЕРЫКІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1945 г. – першая чвэрць XXI ст.) (9 гадзін)

Распад каланіяльнай сістэмы. Набыццё незалежнасці. Краіны, якія сталі на шлях развіцця. «Халодная вайна» і трэці свет. Новыя дзяржавы ў пошуках стабільнасці. Перашкоды на шляху развіцця.

Кітай у 1945–1978 гг. Утварэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі (далей – КНР). Аднаўленчы перыяд. Палітыка «трох чырвоных сцягоў». Курс на рэгуляванне эканомікі. Культурная рэвалюцыя.

КНР. Кітай пасля смерці Маа Цзэдуна. Рэфармаванне сацыялістычнага грамадства. Знешняя палітыка КНР.

Японія. Пасляваенная Японія. Сан-Францыскі дагавор. Эканамічнае развіццё. Палітычнае развіццё. Сучасная Японія.

Індыя. Дасягненне незалежнасці. Індыя – брытанскі дамініён. Утварэнне рэспублікі. «Курс Неру». Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Індыі ў 1964 г. – першай чвэрці XXI ст. Праблемы знешняй палітыкі.

Краіны мусульманскага свету. Агульная характарыстыка. Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі ў арабскім свеце. Егіпет. Іран. Турцыя.

Краіны Лацінскай Амерыкі. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Палітычнае жыццё. Рэформы, ваенныя дыктатуры і рэвалюцыі (Мексіка, Куба, Чылі, Бразілія).

Лакальныя войны і канфлікты. Араба-ізраільскі канфлікт. Вайна ў В'етнаме. Карэйская вайна. Войны ў Афганістане і зоне Персідскага заліва.

Урок абагульнення.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

асноўныя падзеі гісторыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пасля Другой сусветнай вайны, іх даты;

азначэнні паняццяў: дэкаланізацыя, краіны, якія сталі на шлях развіцця (краіны трэцяга свету), Рух недалучэння, неакаланіялізм, мааізм, «курс Неру», ісламскі фундаменталізм;

імёны гістарычных дзеячаў вывучаемага перыяду: Маа Цзэдун, Дэн Сяапін, Сі Цзіньпін, Індзіра Гандзі, Фідэль Кастра;

найважнейшыя дасягненні культуры, навукі і тэхнікі ў краінах Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі ў пасляваенны перыяд;

умець:

лакалізаваць на гістарычнай карце асноўныя падзеі гісторыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пасля Другой сусветнай вайны; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах і працэсах;

характарызаваць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пасля Другой сусветнай вайны: «год Афрыкі», культурная рэвалюцыя ў Кітаі, асноўныя этапы дэкаланізацыі краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі;

параўноўваць гістарычныя факты: эканамічнае развіццё Кітая ў гады культурнай рэвалюцыі і пасля смерці Маа Цзэдуна.

Выніковае абагульненне.